**А. М. Кушнярэвіч**

# ЛЮТЭРАНСКІЯ КІРХІ БЕЛАРУСІ

У кантэксце стылявой эвалюцыі беларускай архітэктуры часоў Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі асобую адметную группу складаюць культавыя помнікі пратэстантызму. Яго храмы ўвасаблялі ідэалогію, апазіцыйную да контррэфармацыі, што зыходзіла з Ватыкана. Таму пашырэнню эстэтычнай канцэпцыі барока храмабудаўніцтва пратэстантаў супрацьпаставіла ўстойлівую мясцовую готыка-рэнесансную і класіцыстычную традыцыі. Архітэктура пратэстанцкіх бажніц у параўнанні з касцельнай вызначалася большым аскетызмам і лапідарнасцю форм. Гэта абумоўлівалася не толькі імкненнем да больш тонкай і сціплай рэлігійнай абраднасці, але і іншай ідэалагічна-канфесійнай праграмай [1, с. 84].

Найбольш пашыраным рэфармацыйным кірункам на Беларусі быў кальвінізм, у меншай ступені лютэранства і арыянства [2, с. 41].

Усе ніжэй разгледжаныя пратэстанцкія храмы – *кірхі* – належылі да аднаго з найбольш радыкальных кірункаў рэфармацыйнага руху – лютэранства. Кірхай жа называліся храмы гэтай царквы ў германамоўным асяроддзі [3]. Распрацаваныя ў XVI ст. пратэстанцкія архітэктурныя традыцыі надалі кірсе асабліва строгія формы, якія ўзыходзяць да готыкі і рэнесансу, а пратэстанцкае вучэнне – аскетычнае ўнутранае аздабленне. Таму ў кульце лютэранства ўвасабляецца прынцып таннай царквы.

На землі Беларусі гэтая царква пачала пранікаць у 1520-я гг. з Лівоніі і Усходняй Прусіі. Трапляла яна непасрэдна з Германіі праз студэнтаў з Вялікага Княства Літоўскага, якія навучаліся ў нямецкіх універсітэтах, асабліва ў Лейпцыгскім. Першым значным прапаведнікам лютэранства ў ВКЛ быў А. Кульва, які выкладаў вучэнне Лютэра ў сваёй школе ў Вільне. У 1544 г. ва Усходняй Прусіі быў адкрыты пратэстанцкі Кёнігсбергскі ўніверсітэт, які значна паспрыяў распаўсюджванню лютэранства ў ВКЛ і Польшчы. З сярэдзіны 1550-х гг. лютэранскія суполкі з'явіліся ў Вільні, Мінску, Слуцку і інш. У пачатку XX ст. на Беларусі засталіся з іх толькі адзінкавыя. Вернікамі былі пераважна асобы нямецкай нацыянальнасці [4].

На Беларусі кірхі захаваліся толькі ў Гродне і Полацку. Афіцыйнай датай заснавання кірхі ў Гродне лічыцца 1793 г., калі С. А. Панятоўскі перадаў будынак сталовай для галандскіх і нямецкіх рамеснікаў, якіх запрасіў у Гродна гродзенскі стараста А. Тызенгаўз, нямецкай лютэранскай суполцы. Канчатковы выгляд кірхі склаўся ў 1873 годзе. У 1912 г. храм перабудавалі ў неагатычным стылі [5, с. 295]. Кірха дзейнічала ў Гродне да 1944 года. Пасля Другой сусветнай вайны тут знаходзіўся архіў. Зараз будынак кірхі вернуты прыхажанам-лютэранам. Гэта – аднанефавая, аднавежавая з пяціграннай апсідай і двумя сакрысціямі пабудова. Галоўны фасад мае сіметрычную выцягнутую па вертыкалі дынамічную кампазіцыю. Высокая вежа-званіца выступае за асноўны аб'ём. Галоўны ўваход аформлены вялікім стральчатым парталам, над ім – акно-«ружа». Вежа завершана высокім ламаным па форме вострым шатром. Сцены бакавых фасадаў абведзены шырокім карнізным поясам і ўмацаваны контрфарсамі. У вокны бакавых сцен устаўлены каляровы вітраж з гатычным па характары малюнкам. Інтэр'ер храма мае выцягнутую па падоўжнай восі сіметрычную кампазіцыю. Асноўная частка храма перакрыта арыгінальным па форме фігурным скляпеннем: цыліндрычнае перакрыццё пераходзіць каля бакавых сцен у плоскую столь на драўляных кранштэйнах. Апсіда раскрываецца ў асноўны аб'ём арачным праёмам. На другім паверсе вежы размяшчаюцца маленькія хоры [6].

Да гэтай жа групы помнікаў лютэранскага храмабудаўніцтва належыць мінская кірха XIX – пачатку XX стагоддзя. Яна была пабудавана ў стылі класіцызму. Прамавугольны ў плане асноўны аб'ём з паўкруглай алтарнай апсідай і прытворам быў завершаны вежай-званіцай у выглядзе ратонды з васьмю калонамі тасканскага ордэра і паўсферычным купалам. Сцены будынка былі рытмічна падзелены пілястрамі. З паўночнага ўсходу да кірхі быў прыбудаваны двухпавярховы будынак, у якім жыў пастыр. Яго сіметрычны па кампазіцыі галоўны фасад выходзіў на вул. Захар'еўскую (цяпер праспект Незалежнасці) і быў завершаны ступенчатым атыкам. У 1930-я гг. кірха была перабудавана пад дзіцячы кінатэатр, а ў 1940-я гг. разбурана [7].

Полацкая кірха была фундавана ў 1775 г., магчыма, спачатку была драўляная. Мураваная ж узведзена на мяжы XIX–XX стст. у неагатычным стылі. З 1901 г. пры храме існаваў лютэранскі прыход. Да асноўнай прамавугольнай ў плане часткі з боку галоўнага фасада далучаецца двух'ярусная чацверыковая вежа, завершаная невысокім чатырохсхільным дахам з пі-

наклямі на вуглах, з процілеглага боку – чатырохгранная апсіда з рызніцай. Галоўны ўваход у першым ярусе вежы вылучаны стральчатым парталам, над якім размешчана круглае акно. Другі ярус мае два побач размешчаныя стральчатыя аконныя праёмы. Абодва ярусы вежы завершаны ляпнымі накладнымі карнізамі з ажурным арнаментальным поясам, вуглы дэкарыраваны лапаткамі. Кутнія часткі асноўнага аб'ёму на галоўным фасадзе і каля апсіды завершаны пінаклямі. Бакавыя фасады першапачаткова былі прарэзаны стральчатымі аконнымі праёмамі. Цяпер іх форма часткова зменена. У 1948 г. кірха была прыстасавана пад абласны краязнаўчы музей. У працэссе гэтых прац быў надбудаваны другі паверх, зроблена прыбудова да бакавога фасада, зменена ўнутраная планіроўка. Цяпер у будынку Полацкай кірхі размешчаны філіял Полацкага гісторыка-археалагічнага заказніка [8].

Усе разгледжаныя вышэй пратэстанцкія храмы Беларусі XIX – пачатку XX ст. належылі да аднаго з радыкальных кірункаў рэфармацыйнага руху – лютэранства. Выяўленне спецыфікі архітэктуры кірхаў у кантэксце іх канфесійна-ідэалагічнай праграммы дае магчымасць больш выразна ўбачыць розныя бакі этнакультурнага жыцця беларускіх земляў перыяду Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі. Разгледжаныя помнікі з'яўляюцца яркай праявай нацыянальна-рэлігійных і мастацкіх традыцый лютэран Беларусі. Стылістычнае вырашэнне іх цэркваў XIX – пачатку XX ст. было выканана ў стылі неаготыкі і класіцызму.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Габрусь, Т. В.* Мураваныя харалы : Сакральная архітэктура беларускага барока / Т. В. Габрусь. – Мінск : Ураджай, 2001. – 287 с.
2. *Іванова, Л.* З гісторыі рэфармацыйнай царквы ў Віцебску ў другой палове XVI–XVII ст. / Л. Іванова // Віцебскі сшытак. – 1996. – № 2. – С. 41–46.
3. Кірха // Рэлігія і царква на Беларусі : энцыкл. давед. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2001. – С. 159.
4. *Казуля, С. В.* Лютэранства / С. В. Казуля, В. Ф. Шалькевіч // Рэлігія і царква на Беларусі : энцыкл. давед. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2001. – С. 184.
5. *Трусаў, А.* Кароткая гісторыя архітэктуры Беларусі / А. Трусаў. – Мінск : Харвест, 2015. – 464 с.
6. *Багласаў, С. А.* Гродзенская кірха / С. А. Багласаў // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. Энцыкл.; рэдкал.: А. А. Воінаў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 168.
7. *Дзянісаў, У. М.* Мінская кірха / У. М. Дзянісаў // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. Энцыкл.; рэдкал.: А. А. Воінаў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 320.
8. *Чарняўская, Т. І.* Полацкая кірха / Т. І. Чарняўская // Архітэктура Беларусі : энцыкл. давед. / Беларус. Энцыкл.; рэдкал.: А. А. Воінаў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 395.